**С. У. Сізянкова,** *саіскальнік*
*вучонай ступені кандыдата навук*
*установы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў».*
Навуковы кіраўнік – **В. М. Сакалова,**
*кандыдат культуралогіі, дацэнт,*
*дацэнт кафедры культуралогіі*
*ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў»*

# БЕЛАРУСКАЯ ШКОЛА ПЛАКАТА: АСАБЛІВАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ

Гісторыя беларускага плаката вядзе адлік з канца XIX ст. Пачаўшы сваё існаванне ў якасці шрыфтавых афіш, агітацыйнай прадукцыі, беларускі плакат з цягам часу становіцца асобным відам мастацтва, якое выконвае інфармацыйную, рэкламную, асветніцкую і эстэтычную функцыі.

На думку А. Г. Галубовіч, «беларускае плакатнае мастацтва – з’ява ўнікальная. Ні ў адной іншай краіне свету яно не атрымала такога інтэнсіўнага развіцця, <…> не прыцягнула да сябе ўвагі лепшых дызайнераў і вядучых мастакоў-графікаў, як у СССР» [5, с. 7].

Беларускі плакат вядомы ва ўсім свеце, што пацвярджаецца прысуджэннем прэмій беларускім мастакам на прэстыжных міжнародных конкурсах і біенале, уключэннем іх твораў у вядомыя калекцыі музеяў такіх гарадоў, як Брно, Лахці, Таяма, Лондан, Нью-Ёрк, Парыж, Варшава і інш.

Асноўваючыся на айчынным і сусветным прызнанні прац беларускіх мастакоў, ці можам мы казаць пра сфарміраваную беларускую школу плаката накшталт швейцарскай ці польскай? Нягледзячы на тое, што дадзены тэрмін выкарыстоўваецца А. І. Атраховіч [1; 2] і А. Г. Галубовіч [5; 6], у навуковых працах яшчэ няма дакладна сфармуляваных тлумачэнняў паняцця і асаблівасцей беларускай школы плаката.

Мастацкая школа, на думку мастацтвазнаўца Оскара Бенеша, – гэта «працяглае мастацкае адзінства, пераемнасць традыцый, прынцыпаў і метадаў» [3]. Даследчык акцэнтуе ўвагу на тым, што паняцце школы ў мастацтве не з’яўляецца чымсьці

адзіным, яно можа прымяняцца ў дачыненні да мастацтва якой-небудзь геаграфічнай вобласці (краіны, мясцовасці, горада), што мае ў пэўны храналагічны перыяд яркія і адметныя стылістычныя рысы і асаблівасці (напрыклад, венецыянская школа, французская школа і г. д.).

Тэрмін «школа» таксама ўжываюць у адносінах да творчасці групы мастакоў, калі яна адрозніваецца блізкасцю мастацкіх прынцыпаў, агульнай мастацкай манерай, альбо паслядоўнікаў і вучняў канкрэтнага мастака. Такім чынам, у паняцці «мастацкая школа» зафіксаваны агульнасць і адзінства прадстаўнікоў школы, а таксама яе ўплыў на мастацкі працэс пэўнага гістарычнага перыяду [7, с. 124].

У школы мастакоў аб'ядноўваюць па некалькіх крытэрыях: агульнасці тэхнічных прыёмаў апрацоўкі матэрыялу (рамесныя цэхі, будаўнічыя арцелі і майстэрні); блізкасці манеры і тэхнікі да выдатнага майстра і прац яго майстэрні (паняцці «майстэрня», «круг майстра»); этнічнай прыкметы (нацыянальная школа); геаграфічных меж (рэгіянальная школа); сувязі з якім-небудзь навучальным цэнтрам (акадэмічная школа) [4, с. 191].

Такім чынам, можна вылучыць наступныя крытэрыі вызначэння мастацкіх школ:

1) тапаграфічнасць – мастацкая школа існуе і развіваецца ў асобнай мясцовасці, якой уласціва адносная этнічная, палітычная і культурная самастойнасць;

2) храналагічнасць – мастацкая школа ўяўляе сабой замкнёную сістэму, якая гістарычна развіваецца і праходзіць пэўныя стадыі (станаўленне, росквіт, заняпад);

3) пераемнасць – прыхільнікі мастацкай школы ў сваёй творчасці імкнуцца да яе цэнтра – аўтарытэту і вопыту вядучага майстра;

4) стылявая і ідэйная агульнасць.

Пачатак фарміравання беларускай школы плаката А. І. Атраховіч адносіць да перыяду 1960–1970-х гг. Гэты працэс звязаны са стварэннем паліграфічнай і выдавецкай базы для сістэмнага развіцця плакатнай графікі, вырашэннем кадравага пытання, мерапрыемствамі па ўдасканаленні сістэмы падрыхтоўкі мастакоў-плакатыстаў, узаемадзеяннем мастацкіх школ, выхадам плаката на міжнародную арэну. У 1972 г. беларускі плакат упершыню трапіў у шорт-ліст VIII Міжнароднага біенале

прыкладной графікі ў Брно (плакат У. Я. Крукоўскага «Звера-нят, нібы братоў малодшых, біць не дазваляй па галаве»).

У канцы 1970-х гг. адзначаецца працэс інтэнсіўнага станаў-лення беларускага плаката і ўваходжання гэтага віду мастацтва ў перыяд прафесійнай сталасці. Менавіта ў азначаны час узрас-тае колькасць майстроў з мастацкай адукацыяй, якія працуюць у жанры плаката, – жывапісцы, сцэнографы, графікі, дызайне-ры У. Васюк, Л. Кальмаева, У. Крукоўскі, У. Жук, К. Ракіцкі, М. Стома, Я. Хайрулін і інш. Прафесійна падрыхтаваныя мастакі ўзбагацілі плакат свежымі ідэямі, прыўнеслі новыя спосабы афармлення кампазіцыі, вырашэння праблем выраз-насці, формы, колеру і г. д. Павялічваецца аб'ём выдаваемай плакатнай прадукцыі, пашыраюцца мастацка-відавыя межы беларускага плаката.

Адной з характэрных асаблівасцей беларускага плакатнага мастацтва можна лічыць «пастановачны», ці «фотапастановач-ны» плакат, які з'яўляецца альтэрнатывай традыцыйнаму, рас-паўсюджанаму ва ўсім свеце маляванаму. Для стварэння такіх плакатаў аўтары вырабляюць у матэрыяле арыгінальныя, неча-каныя аб'екты ці ствараюць інсталяцыі, каб мець магчымасць іх сфатаграфаваць і выкарыстоўваць. Робячы аб'ект, аўтар узмацняе тыповыя якасці звыклага прадмета, дадае яму новую ўласцівасць ці змяшчае ў ненатуральныя ўмовы і тым самым выходзіць за межы побыту і штодзённасці, будуе новую эстэтычную прастору твора, што дазваляе ярка і нестандартна раскрыць любую тэму.

Перыяд зараджэння беларускага «пастановачнага» плаката прыходзіцца на 1980–1990-я гг. Вядомымі прадстаўнікамі беларускай школы плаката гэтага часу з'яўляюцца У. Цэслер, С. Войчанка, Р. Найдзен, А. Наважылаў, Д. Сурскі, Ю. Тарэеў і інш. – менавіта яны сфарміравалі лепшыя традыцыі прафесій-най беларускай школы і прадстаўлялі плакат за мяжой, вызначыўшы яго месца на міжнароднай арэне (Д. Сурскі, Т. Гардашнікава «Хлеб – усяму галава» (1985) – заахвочваючая прэмія Міжрэспубліканскага конкурсу «Якасць. Эканомія. Арганізаванасць» (г. Вільнюс), 2-я прэмія VII Усесаюзнага конкурсу плаката (г. Пенза); Д. Сурскі, Т. Гардашнікава «Кадры решают все» (1989) – шорт-ліст IX Міжнароднага біенале плаката (г. Лахці); С. Войчанка, У. Цэслер «Афган» (1989) – 3-я прэмія VIII Міжнароднага біенале плаката

(г. Лахці); С. Войчанка, У. Цэслер «Cheese» (1995) – спецыяльны прыз і шорт-ліст XVI Міжнароднага біенале плаката (г. Варшава); А. Усціновіч «Волшебная палочка» (1999) – 1-е месца Міжнароднага фестывалю рэкламы «Еўрапейская лінія» (г. Мінск), 3-е месца IX Маскоўскага міжнароднага фестывалю рэкламы).

Акадэмічнай асновай беларускай школы плаката з'яўляюцца кафедра графічнага дызайну ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, кафедра дызайну і моды ў Віцебскім тэхналагічным універсітэце, кафедра камунікатыўнага дызайну ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, кафедра дызайну ў Інстытуце сучасных ведаў імя А. М. Шырокава. Сёння выкладчыцкай дзейнасцю займаюцца такія вядомыя дызайнеры-плакатысты, як У. Васюк, Ю. Тарэеў, Р. Найдзен, У. Голубеў, П. Кашэўскі.

Улічваючы вышэйсказанае, можна зрабіць выснову, што беларуская школа плаката – гэта з'ява мастацтва, якая пачала фарміравацца на тэрыторыі Беларусі ў 1970-я гг., характарызуецца агульнасцю стылявых асаблівасцей, наяўнасцю вядомых майстроў, якія перадаюць свой вопыт і ідэі наступным пакаленням плакатыстаў.

1. *Атрахович, Е. И.* Белорусский плакат: особенности становления национальной художественной школы / Е. И. Атрахович // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. / науч. ред. В. Р. Языкович. – Минск, 2013. – Вып. 7. – С. 89–93.

2. *Атрахович, Е. И.* Искусство плаката Беларуси XX века. Этапы. Тенденции / Е. И. Атрахович // Актуальные проблемы мировой художественной культуры : материалы Междунар. науч. конф., посвящ. памяти проф. У. Д. Розенфельда, Гродно, 25–26 марта 2010 г. : в 2 ч. / ГрГУ им. Янки Купалы. – Гродно, 2011. – Ч. 2. – С. 12–17.

3. *Бенеш, О.* Искусство Северного Возрождения. Его связь с современными духовными и интеллектуальными движениями / Отто Бенеш ; пер. с англ. Н. А. Белоусовой / общ. ред. и предисл. В. Н. Гращенкова. – М. : Искусство, 1973. – 280 с.

4. *Власов, В. Г.* Теория формообразования в изобразительном искусстве : учебник / В. Г. Власов. – СПб. : Изд-во С.-Петерб. ун-та, 2017. – 264 с.

5. *Голубович, А. Г.* Белорусский советский плакат : изоматериал / А. Г. Голубович. – Минск : Беларусь, 2014. – 302 с.

6. *Голубович, А. Г.* Искусство социально-политического плаката Беларуси XX века (эволюция, стилистика и тематика) : автореф. дис. … канд. искусствоведения : 17.00.04 / А. Г. Голубович ; ГНУ «Центр

исследований белорусской культуры, языка и литературы» Нац. акад. наук Беларуси. – Минск, 2012. – 31 с.
7. *Ильина, Е. В.* Предпосылки возможного определения понятия «Архитектурная школа» / Е. В. Ильина // Междунар. науч.-исслед. журнал. – 2013. – № 3 (10). – С. 123–126.

**К. А. Скур'ят,** *саіскальнік*
*вучонай ступені кандыдата навук*
*установы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў».*
Навуковы кіраўнік – **А. М. Нароўская,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны*
*ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў»*

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ КУЛЬТУРЫ ТАТАР МУЗЕЯМІ БЕЛАРУСІ

Сучаснае беларускае грамадства адрозніваецца шэрагам сацыякультурных асаблівасцей, якія шмат у чым вызначаюць яго стан і тэндэнцыі развіцця. Вопыт міжнацыянальных і міжканфесійных зносін у межах беларускай дзяржавы сведчыць аб адсутнасці тут сутыкненняў на этнічнай, расавай і канфесійнай аснове.

Культуры нацыянальных меншасцей прадстаўлены ў шэрагу музеяў рэспублікі, яскрава гэта прасочваецца ў гісторыі татарскай абшчыны рэспублікі.

Татары на беларускіх землях пачалі сяліцца ў XIV ст. у выніку ўнутрыпалітычных канфліктаў у Залатой Ардзе. На рубяжы XIV і XV стст. некалі магутная Залатая Арда ў выніку бясконцых войнаў, дынастычных і родаплемянных спрэчак перажывала глыбокі крызіс.

У пачатку XVII ст. у Вялікім Княстве Літоўскім колькасць татар дасягала 100 тыс. Непасрэдна ў самой Беларусі колькасць татарскіх пасяленцаў, на думку даследчыка І. Б. Канапацкага, складала 20–25 тыс. чал. [5, с. 12]. Асноўнымі цэнтрамі іх рассялення былі Клецкі, Слуцкі, Навагрудскі, Мінскі, Лідскі,